**Мельнікава К.,** студ. гр. 103 БДУКМ
Навук. кір. – Дарашэвіч Э.К.,
доктар філасофскіх навук, прафесар

# БЕЛАРУСЫ Ў ВІЛЕНСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

Віленскі ўніверсітэт, – найбуйнейшая вышэйшая навучальная ўстанова сучаснае Літоўскай Рэспублікі ў Вільнюсе, адна з найстарэйшых ВНУ Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, буйны навуковы цэнтр.

Універсітэт складаюць 12 факультэтаў, 8 інстытутаў, найстарэйшая ў Літве бібліятэка, 3 універсітэцкія шпіталі, астранамічная абсерваторыя, батанічны сад, вылічальны цэнтр і касцёл Святога Яна.

На 1 студзеня 2005 года ў Вільнюскім універсітэце навучалася 22 618 студэнтаў, з якіх 15 789 на дзённым аддзяленні, 6 829 на завочным і вячэрнім. Універсітэт займае некалькі будынкаў і комплексаў будынкаў у розных раёнах Вільнюса і Каўнаса. У Ансамблі Вільнюскага ўніверсітэта ў гістарычнам цэнтры горада месцяцца адміністрацыя, бібліятэка, гістарычны, філалагічны і філасофскі факультэты.

На працягу ўсёй яго гісторыі значную частку студэнтаў Віленскага ўніверсітэта складалі выходцы з беларускіх зямель, напрыклад такія як:

Еўдакім Раманавіч Раманаў – этнограф, фалькларыст, археолаг, займаўся збіраннем твораў вусна-паэтычнай творчасці і даследаваннем культуры і быту беларускага народа. У 1877 Раманаў паведамляў Расійскай акадэміі навук, што за пяць гадоў настаўніцкай працы ім сабрана 2000 беларускіх слоў і з гэтага матэрыялу складзена «Спроба беларускага слоўніка», а ў якасці ўводзін да яго – «Кароткая беларуская граматыка».

Адам Міцкевіч – беларускі паэт,публціыст. Некаторымі з беларускіх літаратараў Міцкевіч вызнаецца за аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і беларускага польскамоўнага паэта Вядомы перадусім сваімі баладамі , паэтычнымі апавяданнямі: драмай «Дзяды» і паэтычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эпапэяй «Пан Тадэвуш», якая прызнаная апошнім вялікім эпасам шляхецкай культуры. Сярод іншых уплывовых твораў Міцкевіча вылучаюцца паэмы «Конрад Валенрод» .

Уладзімір Галубовіч беларускі і польскі археолаг. У 1935–1939 Галубовіч разам з жонкай Цэга-Галубовіч рабіў раскопкі ў Заходняй Беларусі, на тэрыторыі Глыбоцкага, Міёрскага Пастаўскага, Навагрудскага, Лідскага і інш. раёнаў. Склаў археалагічныя карты даследаваных тэрыторый. Вывучаў старажытную Вільню, Мінск, апрацоўваў матэрыялы раскопак Гродна. Вывучаў ганчарную вытворчасць у Заходняй Беларусі. Займаўся этнаграфіяй і тапанімікай.

Францішак Смуглевіч – мастак, заснавальнік беларускай і літоўскай нацыянальнай школаў жывапісу.

Янка Шутовец – беларускі грамадскі і культурны дзеяч, літаратуразнавец.

Таццяна Мікалаеўна Каробушкіна - беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук. У 1977 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Земляробства на тэрыторыі Беларусі ў ХХ – ХІІІ стст.»: прымала ўдзел у даследаваннях Мінску і іншых беларускіх горадў, абследавала шматлікія помнікі Мінскай і іншых вобласцей.

Францішак Багушэвіч – беларускі грамадскі дзеяч, паэт, празаік, публіцыст і перакладчык. Адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, яе класік.

Віктар Іванавіч Анікін – беларускі архітэктар і педагог,які працаваў у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гадоў у Літве; заслужаны архітэктар Беларусі , член-карэспандэнт беларускай акадэміі архітэктуры.

Міксім Іванавіч Гарэцкій – беларускі пісьменнік, крытык літаратуразнавец, лексікограф, фальклярыст.Выкладчык мовы і літаратуры (у т.л., БДУ, Камуністычны ўніверсітэт БССР, Мінскі ветэрынарны тэхнікум, Горацкая сельгасакадэмія (з 1.2.1926)). Загадчык кафедры беларускай мовы, літаратуры і гісторыі Горацкай сельгасакадэміі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Леў Урбанавіч Дашкевіч – беларускі фотамастак, навуковец, вынаходнік, публіцыст, педагог. Чытаў курсы лекцый па сусветнай літаратуры і фатаграфіі ў Мінскім інстытуце народнай адукацыі са снежня 1920 выкладаў французскую мову ў Беларускім політэхнічным інстытуце. У 1921 працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР(прыродазнаўчая секцыя). У маі–чэрвені 1923 удзельнічаў у этнаграфічнай экспедыцыі ў Ігуменскім (цяпер Чэрвеньскі) і Барысаўскім паветах. У 1923 – 1924 навуковы фатограф на медыцынскім факультэце БДУ

Напалеон Орда – беларускі і польскі мастак , кампазітар, піяніст і педагог. Напісаў шэраг твораў для фартэпіяна (рамансы, паланэзы, серэнады, мазуркі). У сярэдзіне 1830-х гадоў – дырэктар Італьянскай оперы ў Парыжы. Вучыўся ў студыі П. Жэрара ў Парыжы і ў Віленскім універсітэце. З 1856 жыве ў Варацэвічах, Гродне , на Валыні. Пакінуў па сабе архітэктурныя замалёўкі вёсак, маёнткаў, замкаў, палацаў, гарадоўБеларусі Літвы і Украіны.

Пасля разгляду дзейнасці беларусаў – выпускнікоў Віленскага універсітэта я зрабіла наступныя высновы:

Першае, Віленскій універсітэт адыграў важную ролю ў развіцці адукацыі, навукі і культуры Беларусі.

Другое, з яго выйшла нямала знакамітых навукоўцаў, літаратараў, мастакоў, падарожнікаў, этнографаў і грамадскіх дзеячаў, якія спрыялі самавызначэнню беларусаў як нацыі ў XIX стагоддзі.

Трэцяе, сёння сувязі Беларусаў з Вілінскім універсітэтам ажыцяўляюцца на ўзроўні акадэмічнага абмену і сумесных даследчых праектаў, якіх, на мой погляд, павінна быць болей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ